**УДК 392.1(476) «19/20»**

# «ПРЫВАТНАЯ» (ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ) ПАМІНАЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ КАНЦА XX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯЎ)[1]

***канд. гіст. навук У.Я. АЎСЕЙЧЫК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*На аснове этнаграфічных матэрыялаў канца XX – пачатку XXI ст. разгледжана індывідуальная («прыватная») памінальная абраднасць беларусаў Падзвіння. Прааналізаваны памінальныя традыцыі на трэці, дзявяты, саракавы (трыццаты) дні, гадавіну з дня смерці. Разгледжаны парадак рытуальных дзеянняў, выяўлены іх лакальныя адрозненні ў межах Падзвіння. Да этналагічнага вывучэння прыцягнуты новыя палявыя матэрыялы, частка якіх зафіксавана аўтарам. Вынікі даследавання будуць карысныя для вывучэння светапогляду і вераванняў беларусаў.*

**Уводзіны.** У айчынным народазнаўстве практычна адсутнічае ўсебаковы і ўзважаны аналіз сучаснага стану пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў. Такіх даследаванняў не стае як у адносінах да ўсяго беларускага абшару, так і да канкрэтных рэгіёнаў краіны. У сваю чаргу даследаванне дадзенага аспекту народнай культуры з'яўляецца часткай больш аб'ёмнай праблематыкі – функцыянавання культуры беларускага этнасу на сучасным этапе развіцця. Пахавальныя і памінальныя абрады з'яўляюцца адной з найбольш архаічных і складана арганізаваных частак традыцыйнай культуры. У сучасных умовах менавіта пахавальна-памінальная абраднасць валодае магутным механізмам захавання традыцыйнай культуры. Таму актуальнасць яе вывучэння набывае істотнае значэнне. Гэтая частка культуры не толькі ўвабрала ў сябе элементы сямейнай і каляндарнай абраднасці, але ахоплівае значна большы комплекс сацыяльных праяў жыцця грамадства, таму яе вывучэнне не толькі дазваляе выявіць узаемасувязі абрадавых комплексаў сямейнага і каляндарнага цыклаў, але і садзейнічае разуменню асаблівасцей самабытнай культуры беларусаў.

У структуры традыцыйнай памінальнай абраднасці беларусаў прынята выдзяляць «прыватныя» (індывідуальныя) памінальныя дні і «агульныя» [1, с. 81; 2, с. 148]. Першыя звязаны з памінаннем асобнага нябожчыка (на працягу года, радзей трох, з дня смерці) і застаюцца ў межах працягу пахавальнага абраду. Агульныя памінкі прысвечаны ўшанаванню памяці ўсіх памерлых продкаў і ўключаны ў структуру каляндарнай абраднасці.

У параўнанні з пахавальным абрадам і каляндарнымі памінкамі, этнаграфічныя зборнікі XIX – першай трэці XX ст. змяшчаюць мала інфармацыі аб памінальных абрадах беларусаў Падзвіння, якія адбываюцца на працягу года з дня смерці. Этнограф М. Анімеле ў сваю чаргу адзначаў, што і самі прыватныя памінкі – даволі рэдкая з'ява ў вясковага насельніцтва ў параўнанні з каляндарнымі памінаннямі. У сярэдзіне XIX ст., па словах даследчыка, яны сустракаліся толькі ў заможных сялян [3, с. 212]. Этнограф С. Нячаеў згадваў, што беларусы Бягомльшчыны (сучасны Докшыцкі раён) паміналі памерлых толькі два разы пасля смерці: на саракавы дзень і Прыкладзіны[2] [4, с. 227]. У той жа час М. Нікіфароўскі прыводзіў звесткі аб большай колькасці такіх памінанняў. Ён адзначаў, што ў цэнтральнай і ўсходняй частцы Падзвіння індывідуальныя памінкі адбываліся ў трэці, дзявяты, дваццаць першы, саракавы дні і гадавіну [5, с. 295]. У залежнасці ад часу спраўлення гэтыя памінкі, па словах этнографа, мелі адпаведныя назвы: *«траціны»*, *«шасціны»*, *«дзевяціны»* [5, с. 295]. Аднак больш дэталёва згаданыя памінальныя ўрачыстасці даследчык не апісаў. Не разгледзелі дадзеную частку памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння і іншыя этнографы XIX – першай трэці XX ст. Бракуе такіх матэрыялаў і ў другой палове XX ст. Толькі сістэматычнае даследаванне Падзвіння ў 1990-я – пачатак 2000-х гг. прывяло да назапашвання значнага аб'ёму матэрыялаў па абранай тэме.

Мэта дадзенай працы – разгледзець індывідуальныя памінальныя абрады беларусаў Падзвіння на аснове матэрыялаў канца XX – пачатку XXI ст., вылучыць іх традыцыйныя і новыя элементы, разгледзець парадак рытуальных дзеянняў, выявіць лакальныя адрозненні ў межах рэгіёна.

---

[1] Артыкул падрыхтаваны ў ходзе працы па тэме «Традиционный культурно-языковой ландшафт белорусско-русского (Витебско-Смоленского) пограничья XX – начала XXI в.: символика фольклорных образов, ритуальные функции и их коммуникативные репрезентации» (№ Г14РП-003).

[2] Пад Прыкладзінамі разумеюцца абрадавыя дзеянні, звязаныя з упарадкаваннем магілы (абкладанне магілы дзёрнам, пастаноўка помніка і інш.), якія характэрны для першага года пасля смерці. Больш падрабязна гл.: Аўсейчык, У.Я. Абрад Прыкладзіны ў беларусаў Падзвіння / У.Я. Аўсейчык // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт. II міжнар. навук. канф., Полацк, 17–18 красав. 2014 г.: у 2 ч. / Полацкі дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача, С.А. Шыдлоўскага. – Ч. 1. – Наваполацк : ПДУ, 2014. – С. 144–156.

**Асноўная частка.** У сучасны перыяд, як паказваюць матэрыялы палявых этнаграфічных даследаванняў, падзел памінальных абрадаў на «прыватныя» і «агульныя» ’яўляецца некалькі ўмоўным. Для сучаснага стану традыцыйнай памінальнай абраднасці беларусаў характэрна сціранне межаў паміж агульнымі і індывідуальнымі памінкамі. Як сведчаць матэрыялы палявых даследаванняў, індывідуальныя памінанні перастаюць абмяжоўвацца годам з дня смерці [6, арк. 28, арк. 40; 7, арк. 41]. Колькасць іх таксама ўзрастае. Памяць памерлага ўшаноўваюць іншы раз у дзень смерці і дзень народзінаў [8, арк. 8; 9, арк. 12, арк. 15, арк. 39]. Шэраг элементаў прыватных памінанняў уключаюцца ў каляндарныя памінкі. У каляндарных памінальных абрадах іншы раз ушаноўваюць не агульную групу дзядоў-продкаў, а канкрэтных памерлых. Сведчанні гэтай тэндэнцыі праяўляюцца нават у такім архаічным элеменце як формула-запрашэнне памерлых продкаў на Дзяды. У сучасны перыяд асаблівая ўвага ў запрашэнні памерлых продкаў скіроўваецца не на агульную катэгорыю дзядоў-продкаў, як гэта было ў мінулым, а на нядаўна памерлых родных: *«Завуць, памолюцца Богу, там: “Тата, мама, брат, сестра, а каму некуды ісці, і тых прыглашайце”»*[1]; *«Ну вот прыглашаіш, вот свечачку запаліш, памолісся Богу, а тады як у мяне і мужык памёр тады стаю ўжо ў вакне і заву: “Мама і тата і Валодзя, ён зваўся, прыхадзіце ў Дзяды, і ў каго нема куды, завіце ўсіх сюды”. Вот такія слава гаварылі»*[2]. Праявай дадзенай тэндэнцыі можа служыць і з’яўленне на памінальным стале фотаздымкаў нядаўна памерлых: *«На Дзяды грамнічную свечку палілі, картачкі на стол ставілі, прыгаваравалі, каб прыхадзілі на вячэру»*[3].

У рэгіёне колькасць «прыватных» памінальных дзён, а таксама асаблівасці рытуальных дзеянняў у кожны з іх, адрозніваюцца ў залежнасці ад лакальнай традыцыі і канфесійнай прыналежнасці. Этнаграфічныя крыніцы канца XIX ст. на Падзвінні сярод беларусаў праваслаўнага веравызнання зафіксавалі прыватныя памінальныя абрады на трэці, шосты, дзявяты, дваццаты (дваццаць першы), саракавы дні, у паўгода і гадавіну [5, с. 295; 10, с. 583]. У сучасны перыяд у рэгіёне памінанні на шосты, дваццаты (дваццаць першы дні) і на паўгода пасля смерці амаль не фіксуюцца. Найбольш пашыранымі сярод беларускага праваслаўнага насельніцтва з’яўляюцца памінкі на трэці (або на наступны пасля пахавання), саракавы дні, а таксама ў гадавіну пасля смерці. У беларусаў каталіцкага веравызнання памінальныя абрады адбываюцца на наступны дзень пасля пахавання, трыццаты дзень, гадавіну з дня смерці, радзей на сёмы і дзявяты дні [8, арк. 30; 9, арк. 44; 11, с. 189; 12, с. 140–141].

Разам з іншымі лакальнымі адрозненнямі, для рэгіёна характэрна існаванне некаторай варыятыўнасці ў назвах прыватных памінальных абрадаў. Пераважна яна залежыць ад спосабу адліку часу пасля смерці (па днях, тыднях, гадах). Таму ў асобных лакальных традыцыях назвы аднаго і таго ж памінальнага абраду іншы раз адрозніваюцца. Так, у адных месцах памінкі на саракавы дзень маюць назву «*сарачыны*» або «*саракавіны*», а ў другой – «*шасціны*» (г. зн. памінкі праз шэсць тыдняў) [14, арк. 78; 13, арк. 56; 8, арк. 11]. Дадзеная асаблівасць не абумоўлена толькі тэрытарыяльным фактарам. Нават у адной лакальнай традыцыі назвы прыватных памінальных дзён могуць паходзіць з розных варыянтаў адліку часу пасля смерці [17, с. 198]. У рэгіёне зафіксаваны выпадкі, калі розныя прыватныя памінкі маюць адну і тую ж назву. Так, памінкі на трэці дзень у наш час яшчэ сустракаюцца пад назвай «*трацiны*» [15, р. 68]. На Падзвінні, па сведчанні М.Я. Нікіфароўскага, пад «*трацінамі*» былі вядомы памінкі на дваццаць першы дзень (г. зн. праз тры тыдні) [5, с. 295]. А даследчык К. Фалютынскі ўвогуле пад «*трацінамі*» разумеў памінкі праз тры гады пасля смерці [16, с. 88].

***Траціны.*** У беларусаў Падзвіння як праваслаўнага, так і каталіцкага веравызнання захоўваецца архаічная традыцыя памінаць памерлага ўжо на наступны дзень пасля пахавання. Абрадавыя дзеянні гэтага памінання абмяжоўваюцца наведваннем могілак, і, у шэрагу выпадкаў, спраўленнем там трапезы (як лічыцца, разам з нябожчыкам): *«Ну, на кладбішча, сразу, пахаранілі сягоння, а заўтра ранелька нада ісці на кладбішча, есці несці. Нясуць там яму ўжо перакуску, хто што»*[4]. У рэгіёне традыцыя наведваць магілу памерлага на наступны дзень пасля пахавання ў наш час яшчэ фіксуецца пад назвай «*будзіць памерлага*»: *«На трэці, як памрэ, гэта будзіць нада, абед нясці, заўтрак. Пабудзіць нада, гарэлку нясуць, закуску»*[5]. У гэты дзень, як правіла, могілкі наведваюць толькі родныя памерлага: *«Ходзяць, уся радня ходзіць. Бяруць закуску і ідуць тады на кладбішча. І ўся радня там, каля магілкі гэтай памінаюць. <...> Вот сягоння пахавалі, назаўтра рана нада ісці. <...> Гэта ж кажуць, разам паядзём там, ці пайдзём разам там паснедаем»*[6]. Традыцыйна, на Падзвінні памінальная трапеза адбывалася на самой магіле, якую засцілалі асобным абрусам ці ручніком: *«На заўтра сабіраюцца, ня ўсе ж сабіраюцца, там ці сын, ці дачка, ці маці, колькі чалавек пойдзіць там, ну што прыдуць, магілку засцелюць, па сто грам вып’юць,*

[1] Зап. аўтарам у 2011 г. ад Дранковіч Г.М., 1936 г.н. у в. Шалагіры Докшыцкага р-на.
[2] Зап. аўтарам у 2011 г. ад Дунец Н.А., 1921 г.н. у в. Таргуны Докшыцкага р-на.
[3] Зап. Валодзінай Т.В. у 1998 г. ад Сяднёвай Г.П., 1919 г.н. у в. Бачэйкава Бешанковіцкага р-на.
[4] Зап. аўтарам у 2009 г. ад Крыўко Т.М., 1926 г.н. у в. Осцевічы Мёрскага р-на.
[5] Зап. аўтарам у 2011 г. ад Дранковіч Н.І., 1936 г.н. у в. Гліннае Докшыцкага р-на.
[6] Зап. аўтарам у 2010 г. ад Хрол Л.М., 1922 г.н. у в. Хралы Глыбоцкага р-на.

*пастаяць, паплачуць і пойдуць назад. Ніхто ж не вярнуўся»*[1]. Абавязковым момантам такога памінання, па словах рэспандэнтаў, з'яўляецца пакіданне памерламу ежы на магіле: «*А назаўтра? – Хадзілі будзіць. Палажылі яды. Гарэлку ў чарку, а закуску на тарэлку*» [15, р. 68]. У сучасны перыяд такая традыцыя не заўсёды выконваецца, асабліва з-за ўплыву святароў: «*Ну гэта так на заўтра ходзяць, так. Занясут там, як цяпер гарэлку занясут. Бацюшка, ксендз не разрашаець каб насілі на кладбішча гарэлку, не выпівалі. А раньша тады прынясуць, румачку нальюць, а што там пакойнік той, паложаць там канфеты, пячэнне – птушка з'есць там*»[2]; «*А не, не, уперад бралі, бываець і вып'юць тамака, а цяперака і бацюшка і ксёнз гаворань – гэта лішняе, не нада нічога, каб на магільніку нічога не астаўлялі ежнага. Цвяткі тока прынясуць*»[3]. У гэты дзень памінальная трапеза іншы раз ладзіцца і ў хаце. Гэта адбываецца тады, калі не спраўляюць яе на могілках: «*Ходзяць на кладбішча на следуюшчы дзень. Ну вот свая радня ідуць, сваі хатнікі і болі ніхто. На кладбішча ідуць, а тады ўжо прыйдуць, памінаюць і ўсё*»[4]. Як вынікае з сучасных палявых даследаванняў, у рэгіёне не існуе строгай рэгламентацыі адносна парадку рытуальных дзеянняў, а таксама асартыменту памінальных страў.

***Памінкі на дзявяты і сёмы дні.*** У беларускага праваслаўнага насельніцтва Падзвіння наступныя памінкі ладзяць на дзявяты дзень пасля смерці. Гэты памінальны абрад звязаны з уяўленнем аб провадах душы ў далёкую дарогу, з якой яна нібыта вяртаецца толькі на саракавы дзень [18, с. 381]. Традыцыя памінання памерлых у гэты час распаўсюджана не ва ўсім рэгіёне. У некаторых яго частках яна даволі позняга паходжання: «*Цяпер выдумалі і дзевяты дзень, даўней не было*»[5]; «*Гэта ж і шасьціны бываюць. Цяпер і дзевяць дней. – А даўней не было дзевяці дней? – Не-а. Тры дні, тады шасьціны, а тады як ужо год*»[6]. Такая асаблівасць абумоўлена пашырэннем уплыву царквы на пахавальна-памінальную абраднасць у сучасны перыяд. Памінкі на дзявяты дзень праходзяць даволі сціпла і звычайна без наведвання могілак. Памінальную трапезу ладзяць дома. На ёй прысутнічаюць толькі родныя і самыя блізкія нябожчыка [6, арк. 54; 8, арк. 11; 19, с. 387]. Да гэтага памінальнага дня іншы раз прымяркоўваюць царкоўную службу па памерламу [13, арк. 5; 20, арк. 42]. Сярод каталіцкага насельніцтва Браслаўшчыны зафіксаваны падобны памінальны абрад на сёмы дзень пасля смерці. У рэгіёне ён вядомы пад назвай «жалобны стол» (такую ж назву маюць памінкі на трэці і трыццаты дні) [12, s. 140–141].

***Памінанне на саракавы (трыццаты) дзень.*** Асабліва важнымі ў цыкле сучасных прыватных памінанняў лічацца памінкі на саракавы (у праваслаўных) ці трыццаты (у католікаў) дзень. Згодна з павер'ем пасля смерці чалавека яго душа пэўны час знаходзіцца на зямлі, а пасля 40 (у католікаў – 30) дзён выпраўляецца на неба (у «*вырай*») [21, с. 426; 22, с. 163]. Гэтыя памінкі адзначаюцца як провады душы на «той» свет: «*Гэта я не знаю, як паложэна. Гэта ўжо Бог душу забіраіць. Да сарака дней душа ходзіць, у нас эдак, у рылігіі. А ўжо послі сарака дней Бог тады ўжо судзіць чалавека. Ну эта па рылігіі*»[7]. У беларусаў Падзвіння як каталіцкага, так і праваслаўнага веравызнання важным кампанентам у гэты дзень лічыцца памінальная служба ў храме [20, арк. 20; 23, арк. 37]. На памінкі ў саракавы (трыццаты) дзень у хаце памерлага адбываецца застолле, на якое запрашаюць амаль усіх, хто прымаў удзел у пахаванні. Па сведчанні рэспандэнтаў, такая традыцыя бытуе і ў наш час: «*А на саракавы робіць, а на саракавы сазываюць усіх родственнікаў, капачыстаў, што яму капаюць, гэта ўжо ўсіх*»[8]. Існуе строгае прадпісанне спраўляць гэтыя памінкі не пазней саракадзённага тэрміну: «*Ну ў нас у гэта ў тры дні ідуць на кладбішча, тады ў дзевіць дней, а патом ужэ як сорак, да сарака, ужо калі дні два тры ўпярод здзелаюць, гэта разрышаецца, ну после сарака нільзя*»[9]. Аднак зафіксаваны выпадкі, калі сучаснае вясковае насельніцтва Падзвіння гэтыя памінкі часам ладзіць не строга на саракавы (трыццаты) дзень, а прымяркоўвае да бліжэйшых выходных [19, с. 387].

У сучасны перыяд ход памінальнага застолля ўжо мала захоўвае рытуальных элементаў, але яшчэ існуе патрабаванне ў наяўнасці на памінальным стале абавязковых рытуальных страў. Для Падзвіння найбольш характэрнымі з'яўляюцца тры памінальныя стравы: куцця, поліўка (юшка) і клёцкі. Гэта тычыцца не толькі індывідуальных памінак, але і памінальнай вячэры ў дзень пахавання і каляндарных ушанаванняў [38, с. 40]. Дадзеныя памінальныя стравы таксама характэрны для Барысаўскага і Лагойскага раёнаў Мінскай вобласці, у той час як у другіх раёнах Міншчыны распаўсюджаны іншыя наборы

[1] Зап. аўтарам у 2011 г. ад Шуневіч С.М., 1923 г.н. у в. Чарнічка (II) Докшыцкага р-на.
[2] Зап. аўтарам, Круткіным А. у 2010 г. ад Мацюшонак Ю.М., 1924 г.н. у в. Зерчаніцы Ушацкага р-на.
[3] Зап. аўтарам, Круткіным А., Пятровым І. у 2010 г. ад Радзюша В.Ф., 1928 г.н., Радзюш М.Ю., 1938 г.н. у в. Вострава Глыбоцкага р-на.
[4] Зап. аўтарам у 2009 г. ад Заяц А.А., 1936 г.н. у в. Шарагі Мёрскага р-на.
[5] Зап. Валодзінай Т.В у 2006 г. ад Глазко М.М., 1926 г.н. у в. Баяры Докшыцкага р-на.
[6] Зап. Валодзінай Т.В і Лобачам У.А. у 2006 г. ад Ставер В.Ю., 1935 г.н. у в. Маргавіца Докшыцкага р-на.
[7] Зап. аўтарам у 2012 г. ад Карнацэвіча А.У., 1931 г.н., Карнацэвіч Л., 1929 г.н. у в. Верацеі Пастаўскага р-на.
[8] Зап. аўтарам, Круткіным А., Салаўёвым С., Траццяковай А. у 2010 г. ад Анашкевіч Л.М., 1935 г.н. у в. Шо Глыбоцкага р-на.
[9] Зап. аўтарам у 2011 г. ад Батура В.М., 1928 г.н. у в. Чарнічка (II) Докшыцкага р-на.

рытуальных страў [34, с. 323; 39, л. 322]. У дадзеным элеменце пахавальна-памінальнай абраднасці прасочваецца тыпалагічнае падабенства і нават роднасць традыцыйнай культуры Барысаўскага і Лагойскага раёнаў з Падзвінскім рэгіёнам.

***Жалоба на працягу года.*** У беларусаў Падзвіння жалоба пасля смерці працягвалася цэлы год. На працягу гэтага перыяду ў сем'ях, дзе быў нябожчык, забаранялася спраўляць вяселлі, ўдзельнічаць у розных забавах, спяваць і танцаваць [23, арк. 13; 5, с. 294; 24, s. 96]. Жалоба па памерламу праяўлялася і ў асаблівасцях спраўлення некаторых каляндарных святаў. Так, у тых дамах, дзе на працягу года быў нябожчык, не малявалі мелам крыжоў на Хрышчэнне, а толькі драпалі іх нажом у патрэбных месцах, не абпальвалі жывёлу і людзей «грамнічнай свечкай», на Вялікдзень і Духаў дзень не фарбавалі яйкі, не ставілі «*май*» у Троіцын дзень [5, с. 294]. На Сенненшчыне сям'я не прыбірала двор «маем», калі ў час ад пачатку года да Тройцы ў сям'і памёр нехта з бацькоў [25, с. 221]. Падобныя забароны яшчэ характэрны для сучаснага вясковага насельніцтва Падзвіння. У рэгіёне распаўсюджаным застаецца перакананне, што ў тых сем'ях, дзе на працягу года быў нябожчык, на Вялікдзень не фарбуюць яйкі: «*А на Вялікадні яйкі красілі? – Красілі. Ну, як хто памрэ ў гэты год, тады не. Не красяць ў гэты год. У мяне брат памер, тады братава, на адным гаду памерлі. Дык два гады не варыла яйкі*»[1]. Існуе традыцыя ў гэты перыяд насіць адзенне чорнага колеру. Аднак спецыфіка выканання гэтай традыцыі ў сучасны перыяд можа залежыць ад таго, кім прыходзіцца нябожчык: «*Ну, чорнае. Па матцы носюць жалабу, па дзяцёнку носяць жалабу ў чорным, а па мужыку і па жонцы, кажуць, ня носяць жалабу*»[2].

***Гадавіна («гадаўшчына»*, памінкі *«ў год»).*** Беларускае насельніцтва Падзвіння памінае памерлых таксама праз год пасля смерці. У мінулым, як сведчаць крыніцы, памінанне памерлых праз год пасля смерці не было пашыраным ва ўсім рэгіёне. Адсутнасць яго фіксуецца ў тых частках Падзвіння, дзе распаўсюджаны абрад Прыкладзінаў (заходняя і цэнтральная частка рэгіёна). Пра такую асаблівасць яшчэ памятаюць рэспандэнты: «*Прыкладзіны дзелалі. Усю жызнь у Прыкладзіны. Вот сорак дней, і год у нас не было пераж*»[3]. У наш час абрад Прыкладзіны паступова выцясняецца памінкамі ў гадавіну з часу смерці: «*Прыкладзень ужо ня робяць, робяць год. У мяне брат у горадзе памер, дык ужо не робілі Прыкладзень, але хадзілі на кладбішча. Ня Прыкладзені, а як прыкладаюць у той дзень, а год ужо*»[4]. Можна меркаваць, што ў мінулым абрад Прыкладзінаў якраз і завяршаў цыкл прыватных памінанняў. Аднак пад уплывам шэрагу фактараў, асабліва ўздзеяння царквы, памінальныя абрады ў гадавіну з дня смерці сталі больш распаўсюджанымі на тэрыторыі Падзвіння.

На гадавіну прынята замаўляць памінальную службу па памерламу ў храме [23, арк. 37; 6, арк. 28; 13, арк. 47]. У гэты дзень родныя наведваюць магілу нябожчыка, а потым спраўляюць жалобную трапезу дома [23, арк. 25; 13, арк. 48]. Іншы раз фіксуецца памінальная трапеза ў гэты дзень і на могілках: «*Ну цераз год нада адмячаць, у нас ходзюць. Свечачку запалюць, гэту занясуць яму канфет, закускі, паставяць усе, гарэлку п'юць, у чарачку яму, усе пасядзяць каторыя, стол накрыюць, у каго столікі пароблены, закуску паставяць, гарэлку вып'юць*»[5].

Памінанне ў гадавіну пасля смерці завяршае цыкл прыватных памінак. Аднак на Падзвінні, як сведчаць крыніцы, прыватныя памінанні іншы раз працягваліся да трох гадоў. Пра такую асаблівасць ў рэгіёне яшчэ ў 1820-я гг. пісаў К. Фалютынскі [16, с. 88]. У сучасны перыяд такі тэрмін прыватнага памінання яшчэ фіксуецца ў некаторых частках Віцебска-Смаленскага памежжа сярод вясковага насельніцтва [26, с. 745; 27, с. 111]. Сустракаюцца нават сведчанні аб 15-гадовым памінанні памерлага [27, с. 111]. Такая традыцыя не з'яўляецца распаўсюджанай сярод беларускага і ўвогуле славянскага насельніцтва. Яна існавала толькі ў паўднёвых славян і была зафіксавана ў паўночна-заходняй частцы Балгарыі, на што звярнула ўвагу В. Седакова [28, с. 69].

Разам з абрадавымі дзеяннямі на працягу году (зрэдку – трох) пасля смерці чалавека ў беларускага насельніцтва Падзвіння яшчэ захоўваецца шэраг прадпісанняў і ўяўленняў адносна асаблівасцей ушанавання нябожчыка. Так, у сучасны перыяд пашыраным з'яўляецца ўяўленне, што надмагільны помнік можна ўстанаўліваць толькі пасля году з дня смерці: «*Ну год пройдзе дык памятнік ставяць, а да гэтага не ставяць. Вот так*»[6]. Аднак зафіксаваны выпадкі, калі рэспандэнты называюць такую традыцыю даволі новай: «*Памятнік, як даўна хто там стаўляў. Камень які ўзвернуць на магілку. А цяпер у год стаўляюць*»[7]. Тлумачэнне забароны на ўстаноўку помніка да гадавіны у наш час, па словах рэспандэнтаў,

[1]Зап. аўтарам у 2009 г. ад Плыгаўка М.І., 1936 г.н. у в. Тумілавічы Докшыцкага р-на.
[2] Зап. аўтарам, Круткіным А., Салаўёвым С., Траццяковай А. у 2010 г. ад Анашкевіч Л.М., 1935 г.н. у в. Шо Глыбоцкага р-на.
[3] Зап. аўтарам і Жахоўскім Б. у 2009 г. ад Пецько Г.С., 1931 г.н. у в. Рачныя Докшыцкага р-на.
[4] Зап. аўтарам у 2011 г. ад Дземідовіч М.І., 1924 г.н. у в. Замасточча Докшыцкага р-на.
[5] Зап. аўтарам у 2011 г. ад Васіковіч М.Е., 1936 г.н. у в. Чарніца (II) Докшыцкага р-на.
[6] Зап. Казловым Д. І. у 2013 г. ад Тоўпінец С., 1948 г.н. у в. Шыпулі Бешанковіцкага р-на.
[7] Зап. аўтарам у 2009 г. ад Януковіч Ф.І., 1936 г.н. у в. Гайдукі Пастаўскага р-на.

не столькі абумоўлена традыцыяй, колькі мае практычна-ўтылітарны характар: *«Калі памятнік ставіць? Нада, што б год прашоў. За тое, што заранее зямля садзіцца»*[1].

Прасторавая арыентацыя надмагільных помнікаў (захад – усход) у значнай ступені была абумоўлены канфесійнай прыналежнасцю пахаванага [30, с. 408]. Аднак у шэрагу выпадкаў арыентацыя помніка і спосаб устаноўкі крыжа («у галаве» ці «ў нагах»), як і арыентацыя магілы, вызначаліся не толькі рэлігійнымі прадпісаннямі, але і залежалі ад мясцовай традыцыі: *«Да, усе ў адзін бок, правільна. Ну як начаў першы хто харанічца, так ужо ўсе хароняць. Ня гэта што адзін туды, другі туды, не. <...> А знаю, што ў адну старану, як пачалі, то так усе адзінакава. Прыглядаюцца што абы як»*[2]. Акрамя таго, арыентацыя магілы, якая непасрэдным чынам звязана з прасторавай лакалізацыяй свету памерлых (дакладней з накірункам, у якім ён знаходзіцца), мае яшчэ дахрысціянскія карані. Таму не дзіўнымі падаюцца выпадкі заходняй арыентацыя магіл памерлых беларусаў каталіцкага веравызнання і сёння, асабліва на невялікіх вясковых могілках, дзе ўплыў касцёла не такі істотны.

Памеры, форма і характар надмагільнага помніка, згодна з этнаграфічнымі крыніцамі XIX – пачатку XX ст., указвалі на пажыццёвыя характарыстыкі памерлага. Так, на Падзвінні вышыня надмагільнага крыжа залежала ад узросту памерлага: чым старэйшы нябожчык – тым большы крыж. Такая ж асаблівасць датычылася і памеру надмагільнага насыпу [25, с. 222]. Падобныя ўяўленні яшчэ і зараз фіксуюцца сярод беларусаў Докшыччыны: *«А вялікія драўляныя крыжы? – Гэта ставілі старым, пажылым людзям. А малым ні ставілі. Там жа іх густа – магілачка ля магілачкі. Плітачкі маленькія. Аставаліся ж толькі смалякі – людзі закалкі здароўя. А маленькія раджаліся і ўміралі часта»*[3]. На знешні выгляд магілы ўплывала і полавая прыналежнасць нябожчыка. На Падзвінні надмагільныя крыжы на мужчынскіх і жаночых магілах адрозніваліся па таўшчыні (але не па вышыні) [5, с. 294]. Даўней на магілах жанчын, асабліва тых, якія вызначаліся непрыстойнымі паводзінамі пры жыцці, крыжоў маглі ўвогуле не ставіць [5, с. 294]. На Віцебшчыне, па словах Дз. Зяленіна, «на такую магілу ўказвае толькі магільны ўзгорак. Акрамя таго, у памяць аб жанчынах там перакідваюць праз ручаі і багністыя месцы лёгкія масткі з адной дошкі ці бервяна, на якіх выразаныя крыж, чаравікі або серп, а часам і год смерці жанчыны» [29, с. 351]. Надмагільны помнік іншы раз указваў і на сацыяльны статус памерлага, спецыфічны характар яго прыжыццёвых заняткаў [30, с. 408–409]. Для сучаснага стану пахавальна-памінальных абрадаў беларусаў Падзвіння такія рысы ўжо не характэрныя.

Нягледзячы на захаванне спецыфічных абрадавых элементаў у кожным з памінанняў, многія з якіх маюць архаічны характар, для сучаснага стану памінальнай абраднасці характэрна тэндэнцыя да ўніфікацыі абрадавых дзеянняў асобных індывідуальных памінак, фарміравання яе агульнай структуры. Неад'емнымі кампанентамі кожнага індывідуальнага памінання становяцца царкоўная служба, наведванне могілак і дамашняе памінальнае застолле.

Памінкі на трэці, дзявяты, дваццаты (дваццаць першы), саракавы і гадавы дзні – афіцыйныя памінальныя дні ў праваслаўнай царкве – з некаторымі варыяцыямі сустракаюцца на ўсёй тэрыторыі Беларусі (нават шырэй – сярод праваслаўных вернікаў іншых краін) [31, с. 313; 32, с. 430; 33, с. 407–408; 34, с. 565; 35, с. 525; 36, с. 326]. Акрамя іх на Падзвінні ў асобных лакальных традыцыях зафіксаваны даволі спецыфічныя памінальныя абрады, якія адбываліся на працягу года з дня смерці. Так, сярод беларусаў Себежскага павету Ф. Сярэбранікаў засведчыў аб адной цікавай памінальнай урачыстасці, якая адбывалася ў першую нядзелю пасля пахавання. У гэты дзень родныя памерлага адпраўляліся ў царкву, куды прыносілі ў глінянай ці драўлянай місе куццю, накрытую двума ці трыма невялікімі хлябамі. Падчас літургіі куцця ставілася каля абраза, а ў верхні хлеб устаўлялася свечка, якая гарэла падчас літургіі і паніхіды. У гэты ж дзень у царкве памінаЛі памерлых. Пасля службы хлябы аддаваліся прычту, а куццю падносілі родным і знаёмым; астаткі аддаваліся жабракам, што былі ў гэты час у храме [37, с. 89–90]. У сучасны перыяд такая традыцыя не была зафіксавана ў рэгіёне.

**Вывады.** Такім чынам, аналіз этнаграфічных матэрыялаў канца XX – пачатку XXI ст. дазваляе зрабіць наступныя высновы: 1) у сучаснай памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння захоўваюцца асноўныя індывідуальныя памінкі (на трэці, саракавы (у праваслаўных) ці трыццаты (у каталікоў) дні, гадавіну з дня смерці); 2) у рэгіёне існуе традыцыя памінаць памерлага ўжо на наступны дзень пасля пахавання (яшчэ фіксуецца пад назвай *«будзіць памерлага»*); важнымі ў цыкле прыватных памінанняў праваслаўных беларусаў лічацца памінкі на саракавы (у праваслаўных) ці трыццаты (у католікаў) дзень і гадавіну з дня смерці, не страціла свайго значэння спраўленне жалобы па памерлым на працягу года з дня смерці (праяўляецца ў нашэнні адзення цёмных колераў, асаблівасцях святкавання каляндарных свят, забароне на ўдзел у розных забавах); 3) у межах гістарычна-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння індывідуальная памінальная абраднасць беларусаў мае лакальныя адрозненні (праяўляецца ў назвах абрадаў, іх коль-

[1] Зап. аўтарам у 2010 г. ад Хрол Л.М., 1922 г.н. у в. Хралы Глыбоцкага р-на.
[2] Зап. аўтарам, Чараўко В.У. у 2009 г. ад Алеська Л.М., 1939 г.н. у в. Ульшына Мёрскага р-на.
[3] Зап. Валодзінай Т.В., Лобачам У.А. у 2007 г. ад Ставера В.А., 1929 г.н. у в. Маргавіца Докшыцкага р-на.

касці, асаблівасцях правядзення); 4) у наш час зніклі памінкі на шосты, дваццаты (дваццаць першы) дні, у паўгода, адбываецца спрашчэнне і ўніфікацыя прыватных памінальных абрадаў (знікненне шэрагу частак і элементаў, тэндэнцыя да ўніфікацыі абрадавых дзеянняў розных памінак, прывядзення іх да агульнай структуры), характэрна сціранне межаў паміж агульнымі памінкамі і індывідуальнымі, адбываецца павелічэнне колькасці апошніх.

ЛІТАРАТУРА


1. Толстая, С.М. Деды в полесском народном календаре / С.М. Толстая // Балто-славянские этнокультурные и археологические древности. Погребальный обряд : тезисы докладов / Ин-т славяноведения и балканистики АН СССР ; редкол.: Вяч.Вс. Иванов (отв. ред.), Л.Г. Невская. – М., 1985. – С. 81–83.
2. Шарая, О.Н. Ценностно-нормативная природа почитания предков / О.Н. Шарая. – Мінск : Тэхналогія, 2002. – 249 с.
3. Анимеле, Н. Быт белорусских крестьян / Н. Анимеле // Этнографический сборник. – 1854. – Вып. II. – С. 111–268.
4. Нечаев, С. О поминовении умерших: нечто из религиозных обрядов и суеверий в Бегомльском приходе Борисовского у. / С. Нечаев // Мин. епарх. ведом. – 1874. – 15 апр. (ч. неофиц.). – С. 227–232.
5. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н.Я. Никифоровский. – Витебск : Губ. тип.-литогр., 1897. – [2], X, 307, 30 с.
6. Архіў гісторыка-філалагічнага факультэта ПДУ (АГФФ). – Ф. 1. – Воп. 3. – Спр. 4. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ў Докшыцкі раён (ліпень 2011 г.). – Сш. 2. Запісы Аўсейчыка У.Я.
7. АГФФ. – Ф. 1. – Воп. 3. – Спр. 8. Палявыя этнаграфічныя запісы Аўсейчыка У.Я. (2005–2011 гг.). – Сш. 8. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ў Мёрскі і Верхнядзвінскі раёны (16–17 чэрвеня 2009 г.).
8. АГФФ. – Ф. 1. – Воп. 3. – Спр. 8. Палявыя этнаграфічныя запісы Аўсейчыка У.Я. (2005–2011 гг.). – Сш. 9. Матэрыялы этнаграфічнай экспедыцыі ў вв. Лоўжа і Пабеда Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці (2009 г.).
9. АГФФ. – Ф. 1. – Воп. 3. – Спр. 11. Матэрыялы апытання па тэме : «Пахавальна-памінальная абраднасць беларусаў Падзвіння» (2012–2013 гг.).
10. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – СПб. : Тип. имп. акад. наук, 1890. – Т. 1. – Ч. 2 : Бытовая и семейная жизнь белорусов в обрядах и песнях. – XXXIV, 712, [4] с.
11. Верещагина, А.В. Праздники и таинства в жизни христиан Беларуси / А.В. Верещагина. – Минск : Бел. наука, 2009. – 232 с.
12. Chodorowska, I. Świat żywych i umarłych (możliwości transgresji) / I. Chodorowska // Браслаўскія чытанні : матэрыялы 4-й навук.-краязн. канф., Браслаў, 24–25 красав. / Брасл. музей. аб’яд-не, Брасл. краязн. тав-ва ; рэдкал.: К. Шыдлоўскі [і інш.]. – Браслаў, 1997. – С. 133–145.
13. АГФФ. – Ф. 1. – Воп. 3. – Спр. 5. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Пастаўскі раёны (4–18 ліпеня 2012 г.). – Сш. 1. Запісы Аўсейчыка У.Я.
14. АГФФ. – Ф. 1. – Воп. 3. – Спр. 2. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Докшыцкі раён (ліпень 2009 г.). – Сш. 1. Запісы Аўсейчыка У.Я., Філіпенкі У.С., Лобача У.А., Зянько В., Шаўчэнка Я.
15. Lietuvių literatūros ir tautosakos instituto Lietuvių tautosakos rankraštynas. – 7647. Tautosaka 2006 m. liepos mėnesį prie Neris ištakų surinkta Lietuvos ir Baltarusijos mokslininkų grupės, vadovaujamos Vykinto Vaitkevičiaus.
16. Фалютынский, К. Народные праздники, увеселения, поверия и суеверные обряды жителей Белоруссии / К. Фалютынский // Вестник Европы. – 1828. – март-апрель. – С. 75–92.
17. Полацкі этнаграфічны зборнік / Полац. дзярж. ун-т ; [уклад., прадм. і паказ. У.А. Лобача]. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Вып. 2 : Народная проза беларусаў Падзвіння: у 2 ч. – Ч. 2. – 368 с.
18. Сысоў, У.М. З крыніц спрадвечных / У.М. Сысоў. – Мінск : Выш. шк., 1997. – 415 с.
19. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. – Мінск : Бел. навука, 2004. – Т. 2 : Віцебскае Падзвінне / Т.Б. Варфаламеева, А.М. Боганева, М.А. Козенка. – 910 с.
20. АГФФ. – Ф. 1. – Воп. 3. – Спр. 3. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Ушацкі раёны (5–22 ліпеня 2010 г.). – Сш. 1. Запісы Аўсейчыка У.Я., Філіпенкі У.С., Круткіна А.
21. Валодзіна, Т. Сарачыны / Т. Валодзіна, У. Васілевіч // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. – Мінск, 2011. – С. 426.
22. Лобач, У. Душа / У. Лобач, Л. Салавей // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. – Мінск, 2011. – С. 162–163.
23. АГФФ. – Ф. 1. – Воп. 3. – Спр. 4. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ў Докшыцкі раён (ліпень 2011 г.). – Сш. 1. Запісы Аўсейчыка У.Я.
24. Sielicki, F. Pieśni pogrzebowe i dziadowskie śpiewane w b. powiecie Wilejskim / F. Sielicki // Acta Universitatis Wratislaviensis. Slavica Wratislaviensia. – Warszawa–Wrocław, 1982. – T. 22. – S. 91–104.
25. Шлюбскі, А. Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны : у 2 ч. / А. Шлюбскі. – Мінск : Інбелкульт, 1928. – Ч. 2. – 259 с.
26. Шагалеева, Т.А. Традыцыі, абрады, вераванні / Т.А. Шагалеева // Памяць: Гарадоцкі раён : гіст.-дакум. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 2004. – С. 744–748.
27. Смоленский музыкально-этнографический сборник. – М., 2003. – Т. 2 : Похоронный обряд. Плачи и поминальные стихи. – 760 с.
28. Седакова, О.А. Поэтика обряда: погребальная обрядность восточных и южных славян / О.А. Седакова. – М. : Индрик, 2004. – 320 с.
29. Зеленин, Д. Восточнославянская этнография / Д. Зеленин. – М. : Наука, 1991. – 511 с.
30. Лобач, У.А. Міф. Прастора. Чалавек: традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве / У.А. Лобач. – Мінск : Тэхналогія, 2013. – 511 с.

31. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. – Мінск : Бел. навука, 2001. – Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе / Т.Б. Варфаламеева [і інш.]. – 797 с.
32. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. – Мінск : Выш. шк., 2006 – Т. 3 : Гродзенскае Панямонне / В.І. Басько [і інш.] : у 2 кн. – Кн. 1. – 608 с.
33. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. – Мінск : Выш. шк., 2008. – Т. 4 : Брэсцкае Палессе / В.І. Басько [і інш.] : у 2 кн. – Кн. 1. – 559 с.
34. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. – Мінск : Выш. шк., 2010. – Т. 5 : Цэнтральная Беларусь / В.І. Басько [і інш.] : у 2 кн. – Кн. 1. – 847 с.
35. Кремлева, И.А. Похоронно-поминальные обычаи и обряды / И.А. Кремлева // Русские / отв. ред. В.А. Александров, И.В. Власова, Н.С. Полищук. – М., 2005. – С. 517–532.
36. Пономарев, А.П. Похороны / А.П. Пономарев // Украинцы. – М., 2000. – С. 324–326.
37. Серебренников, Ф. Обычаи и обряды крестьян Себежского уезда при крестинах, свадьбе и похоронах / Ф. Серебренников // Памятная книжка Витебской губернии на 1865 г. – СПб., 1865. – С. 75–90.
38. Аўсейчык, У.Я. Восеньскія Дзяды ў беларусаў Падзвіння: рэгіянальныя асаблівасці і лакальныя варыянты / У.Я. Аўсейчык // Весн. Полац. дзярж. ун-та. Сер. A, Гуманітар. навукі. – 2012. – №9. – С. 35–44.
39. Дулебо, А.И. Современный общественный и семейный быт белорусских колхозников : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.07 / А.И. Дулебо. – Минск, 1966. – 367 л.

*Паступіў 26.06.2015*

## «PRIVATE» (INDIVIDUAL) FUNERAL CEREMONIAL RITES OF BELARUSIANS OF DVINA REGION (ON THE MATERIALS OF THE END OF 20TH – BEGINNING OF THE 21ST CENTURIES)

***U. AUSEICHYK***

*On the basic of the ethnographic materials of the end of the 20th – beginning of the 21st centuries the individual (“private”) funeral ceremonial rites of the Belarusians of Dvina region are considered. The funeral traditions on the 3rd, 9th, 40th (30th) day, yearly commemoration are analyzed. The order of ritual actions is considered, their regional features and local peculiarities are determined in the borders of the Dvina region. The new field materials are drawn into ethnological studies, part of them is established by the author. The results of the research will be useful for studying of the world outlook and beliefs of the Belarusians.*